Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

ДУМКА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—8 (Wileńska 12 m. 8) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Невыкарыстаныя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Адказы [illegible] залежаць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 9 Вільня, Субота 28-га студзеня 1928 г. Год I

По загаду Камісара Ураду на м. Вільню сканфіскаваны № 5 „Думкі Працы“ за перадавіцу „Наш адказ“ (Сялянскай Ніве“) і карэспандэнцыю „Нікай жыве асьвета ў роднай мове“; № 6 той-жа газэты сканфіскаваны за перадавіцу „Два лягеры“, верш „Да сонца“ і нататку „Ахвяры палітычным вязьням“; № 7 той-жа газэты—за перадавіцу „Яшчэ раз нам аднае Ярэмічаўскай кампаніі“ і № 8 той-жа газэты сканфіскаваны за карэспандэнцыю „Памагаюць“.

Паўтара тыдня.

Як відно з папярэдняй увагі, газэта „Думка Працы“, якая была за апошні час адзінаю газэтаю, што бараніла інтарэсы беларускіх сялян і работнікаў, была х адзінаю (мы ў гэтым пэўны) ўцеханю—сканфіскавана чатыры разы падрад. Загалоўкі артыкулаў, за якія газэта была сканфіскавана, вельмі яскрава сьведчаць аб тым, што запраўды прадстаўляе Ярэмічаўская кампанія ў адносінах да рознага роду ўгоды і іх сэзонных лёзунгаў. Мы ня будзем тлумачыць правільнасьці ці няправільнасьці канфіскатаў, з нашага пункту гледжаньня. Тыя, хто ў гэтым зацікаўлены, мае разумецца і так. Мы толькі канстатуем факт, што беларускія працоўныя гушчы асталіся ў самы гарачы час для іх час у поўным няведаньні, што робіцца навагул—як *паўтара тыдня*. Мы добра ведаем, з якім нецярпеньнем цярпер беларускія працоўныя на вёсцы і ў месьце чакаюць свае газэты, мы адчуваем тую зьнэрвованасьць, якая пануе ў зьвязку з гэтым сярод працоўных, бо-ж кожнаму хочацца ведаць, *што рабіць нарэшце з выбарамі*.

Мы адчуваем, што ў такія мінуты нічога-няведаньнямі людзі жывуць рознымі меркаваньнямі, якія інады могуць прывясьці да непажаданых вынікаў.

Толькі наша гарачая вера, наша нязломная пэўнасьць у поўную сьведамасьць беларускіх працоўных гушчаў, іх сьпеласьці і ўменьне разьбірацца ў-ва ўсёй складнасьці цяперашняй перадвыбарнай сітуацыі, у ня скрытай ад іх *праўдзе* — хто іх прыяцель, а хто іх вораг, прадажнік і здраднік—дае нам падставу не баяцца за лёс тых мільённых галасоў на надыходзячых выбарах, у якіх беларускія сяляне і работнікі ў згодзе з працоўнымі гушчамі іншых нацыянальнасьцяў Польшчы — пакажуць *сваю адзіную* запраўдную волю і імкненьне — мець *сваіх* прадстаўнікоў у будучым Сойме.

Гэтаму нам зарукай тое давэрра беларускіх працоўных гушчаў да *свае*й прэсы, тая лучнасьць іх між сабой, якую мы бачым за апошні час усьцяж растучымі і ўсьцяж паглыбляньнямі.

Мы і надалей горача верым, што та *фактычная* ідэйная лучнасьць між беларускімі працоўнымі гушчамі і *іх прэсаю* ня толькі не перарвецца з паўтара-тыднёвым штучным перарывам, які стаўся памімо волі абедзьвюх старон, а яшчэ больш зацясьніцца і што на гэтым не адыграюць ані чыстыя рукі Умястоўскія і Паўлюкевічы, ані Ярэмічы, Рагулі і Станкевічы пад дзьвюма фірмамі, ані ўсе болей розныя польскія буржуазна-ўгодніцкія перадвыбарныя шопкі, якія навыраюцца за гэты час без ліку.

Дык будзем сьмела глядзець у будучыню, пэўныя ў свае ўласныя сілы, сьвядомасьць і волю!

Пагроза угодніцкага крызісу у-ва Францыі.

Газэты зьмясьцілі цікаўную фатаграфію, паказваючую—францускі парлямант, ачэплены з усіх бакоў вялізарнай масай узброеных паліцэйскіх усялякага рангу... Подпіс: так адбывалася пасяджаньне парляманту, на якім палата павінна была прыняць пастановы аб выдачы суду камуністычных паслоў...

Беларуская прэса ў свой час адзначала небясьпеку для ўраду Пуанкарэ стала яго тасаванай адносна да парляманту „тактыкі ўльтыматумаў“, гэта значыць—тактыкі змушаньня парляманту да прыняцьця ўрадавых праказіцыяў—пад тэрорам адстаўкі габінэту...

Гэткі спосаб націску на парлямант можна тасаваць, навет — мусіць часам тасаваць кожны шануючы сябе і сваю праграму ўрад; але тасаваць такі вынятковы спосаб „абароны“ сваіх праектаў для ўраду, значыць — заўсёды ўсьцяж раздражняць проці ўраду парлямант... А перадусім, гэта значыць, што ў самым парлямантнае, які няздольны выдзяліць з сябе адказны яго складу і духу ўрад,—нешта няладна...

Якраз у такім палажэньні аказаліся — францускі ўрад і Сойм. Францускі Сойм, які мае партыйную большасьць—левую, павінен быў—пасьля няўдалай спробы чыста левага ўраду ўпарадкаваць дзяржаўныя фінансы і гаспадарку, сам уступіў месца правай меншасьці, аддаўшы ёй галоўныя кіруючыя становішчы ў габінэце, амаль ня поўную дыктатуру ў-ва ўнутраных справах краю...

Пуанкарэ, які запраўды здолеў шмат зрабіць для ўпарадкаваньня францускіх фінансаў, стаў асабіста вельмі папулярным у краі і—амаль-што незамяняльным, як кіраўнік фінансава гаспадарчага жыцьця Францыі. Але зразумела-ж — гэтым асаблівым палажэньнем самога Пуанкарэ ня можа не карыстацца правіца—з метамі ўжо чыста „ўнутранай палітыкі“,—тым больш, што і ўнутраныя справы аддадзены яркаму прадстаўніку правіцы—нацыяналісту Барту. Гэты Барту і пачаў забіраць усё больш сілы ў габінэце, востра выступаючы—ня толькі проці камуністаў, але і проці сацыялістаў...

Гэтае засільле правіцы ў габінэце асабліва ярка высьвятляецца—якраз на справе арыштаваньня камуністычных паслоў, дый яшчэ—з гвалтам над канстытуцыяй.—Справа ў тым, што — увосені наміж Пуанкарэ і лявіцай была зроблена ўмова — у справе бюджэтнай дыскусіі. Паводле ўмовы, лявіца гарантавала прэм'еру, што да разгляду і прыняцьця бюджэту парлямант ня будзе займаць ураду і сабе час ніякімі інтэрпэляцыямі. За гэта дый яшчэ за нешта — Пуанкарэ з свайго боку абяцаў лявіцы, што ня будзе дамагацца ўльтыматыўна выдачы камуністычных паслоў суду да тэрміну іх паўнамоцтваў, што лявіца лічыла скандальным нарушэньнем бязумоўнай нятыкальнасьці дэпутата, аднэй з галоўных падставаў традыцыйнай палітычнай праграмы радыкальнай лявіцы... Пуанкарэ дэклараваў тады пакінуць цалком на волю парляманту гэтую справу. Лявіца сумленна выпаўніла свае забавязаньні: бюджэт закончаны ў паложаны тэрмін—без усялякіх інцыдэнтаў. А вось — Пуанкарэ—пад націскам правіцы і яе павадыра ў урадзе мін. Барту—толькі-што—ізноў „пад тэрорам адстаўкі“—ультыматыўна патрэбаваў ад парляманту, значыць — ад яго радыкальна - сацыялістычнай большасьці — здрады яе традыцыяў—выдачы паслоў...

Ізноў — баючыся фінансавага развалу Францыі—парлямант уступіў... Але—як піша сама француская прэса, навет умеркаваных кіраўнікоў—гэтая перамога ўраду—небясьпечная для яе перамога... Вось як даносіць з Парыжу навет карэспанд. эндэцкага „Кур. Варш.“.

„Палітычная атмасфэра ў-ва Францыі папросту насычана электрычнасьцю.—Ад маманту гвалтоўнай дыскусіі ў парлямантнае— у справе арыштаваньня камуністычных паслоў—бура папросту навісла ў паветры... — чуткі аб адстаўцы міністра, займаючага адно з найважнейшых становішчаў у габінэце (ясна—мін. унутр. справаў—Барту... Рэд)—выклікалі настрой нэрвовасьці, адчуваны ўсімі“...

І далей:

„Толькі страх перад адказнасьцю за скуткі выкліканага ўрадавага крызісу стрымлівае лявіцу (ад рашучых крокаў).

Скрытая барацьба паміж Пуанкарэ і даўным хаўрусом лявіцы, а прынамсі — яго левым крылом, выходзіць ізноў наяў... і мае разьвярнуцца ў часе распраў над праектам аднагадовай службай у войску“...

І ў канцы:

„Увіду гэтай трывожнай атмасфэры вялікі знак запытаньня вісіць над справай стабілізацыі франка“...

Апошнія словы значаць, што ізноў — калі парлямант ня згодзіцца—значыць: лявіца праваліць... з праектам ураду, Пуанкарэ мае сам паставіць „пытаньне аб даверы“, ці—пагрозу сваей адстаўкай...

„Белы тэрор фінансавай дыктатуры“, відаць, страшэнна раздражняе лявіцу, якая мае вялікую большасьць—як у Сойме, таксама і ў краі...

Трэба ведаць, што збліжаецца час выбараў у парлямант, які адбудзецца ўжо гэтай вясной... Лявіца мае ўсе даныя спадзявацца поўнай перамогі. Дык хоча ісьці на выбары—у-ва ўсёй „чысьціні сваіх палітычных традыцыяў радыкалізму“... А тутака — у яе „пасыве“ аказваецца — 2 гады „ціхага сядзеньня“ над камандай Пуанкарэ і яго найбольш рэакцыйных калегаў, нарушэньне дэпутацкай нятыкальнасьці дый яшчэ з гвалтам над канстытуцыяй. Дый яшчэ шмат чаго, што нарабіла лявіца яшчэ тады, калі ўрадавала сама — імпэрыялістычныя войны ў Марокко, Сірыі, развал фінансаў і т. д. і т. д... Есьць, па чым біць сацыял-радыкальную лявіцу—камуністам...

Дык можна спадзявацца, што — хаця перад самымі выбарамі—радыкал-сацыялісты — „пакажуць сябе малайцамі“ — зваліўшы „пад заслону“ — рэакцыйны ўрад Пуанкарэ, якога слухаліся—больш як два гады...

Выбарная хроніка.

Перадчасная пацеха...

Консалідацыя польскіх буржуазных сілаў пад штандарам м. Пілсудскага ўрастае— як сьцвердзіць польская буржуазная прэса. З гэтых вывадаў яна вельмі цешыцца.

І сапраўды, што да польскай правіцы— дык урадавы кірунак Пілсудскага карыстаецца вялікім посьпехам. У Пазнаншчыне і на Памор'ю стварылася каталіцка нацыянальная гаспадарчая ўнія, у якую ўвайшлі кансэрватысты (манархісты), цэхі рамесьнікаў, мяшчанская сярэдняя кляса і Саюз „Маладая Польшча“. Унія гэта хоча абаперціся на супрацоўніцтва з урадам Пілсудскага. Такім чынам эндэцыя асталася ў Пазнаншчыне асіротцелай і, відаць, вялікага посьпеху мець ня будзе.

У кароннай Польшчы і ў Заходняй Галіцыі правіца, што стаіць у апазіцыі да ўраду Пілсудскага, разьбілася на два лягеры: „Польскі Каталіцкі блёк“, які склалі Пяст і Хадэцыя і Каталіцка — нацыянальны Камітэт—з эндэцыі.

У Вільні трэба спадзявацца, што эндэцыя і хадэцыя пойдуць разам і пэўне-ж будуць мець папулярнасьць сярод віленскіх дэвотак. Затое, трэба думаць, што ў іншых акругах на нашых землях хадэцыя і эндэцыя ня будуць выстаўляць сваіх сьпісаў, уступаючы месца іншым польскім сьпіскам з пад сьцягу Пілсудскага, бо набаяцца нападкаў усіх палякоў за разьбіваньне адзінага польскага фронту на так небясьпечным мейсцы, як нашы землі, дзе 90% складаюць беларусы.

Тры цікавыя вывады вынікаюць са складаўшайся перадвыбарнай сітуацыі ў Польшчы:

1. Урад Пілсудскага кансалідуе ўсе сілы і з правіцы і з лявіцы, якія толькі могуць з ім дагаварыцца—пачынаючы манархістамі і канчаючы некаторымі „сацыялістычнымі“ адламамі. Консалідацыя гэта робіцца або ўцягваньнем розных груповак ад манархістаў да „сацыялістаў“ у „Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з ўрадам“, або паразуменьнем з рознымі палітычнымі групоўкамі, захоўваючы іх імя і самастойнасьць працы, шляхам забясьпечаньня падтрыманьня ўраду Пілсудскага. Кампраміс часамі ідзе навет так далёка, што „Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам“ уступае месца гэтым групоўкам, абы толькі не разьбіваць галасоў. Так у Пазнаншчыне „Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам уступіў месца „Каталіцка-нацыянальнай гаспадарчай уніі“.

2. Разьбівае ўсе проці - ўрадавыя партыі, як толькі можа і дзе толькі можа. У Пазнаншчыне, як мы бачылі, эндэцыя засталася адасобленай, дзякуючы ўступкам Каталіцка-нацыян. уніі, а на нашых землях тая-ж эндэцыя засталася выпертай на асаве чыста польска нацыянальных мамантаў.

3. Стараецца захаваць за ўсякую цану еднасьць ў Заходняй Беларусі і ў Усходняй Галіцыі. Гэтага прынцыпу трымаюцца навет правыя польскія партыі, апазіцыйна настроеныя да ўраду Пілсудскага. Тут, бачыце, маюць надзеі на значны лік галасоў на польска буржуазныя сьпіскі. Дык разьбівацца ня прыходзіцца. Затое з вялікай радасьцю вітае, падтрымоўвае ды стварае разьбіцьцё ды дэзар'ентацыю ў лягеры працоўным польскай буржуазіі. Яна вельмі цешыцца, што ў беларусаў паўстала каля 10 розных палітычных угрупаваньняў, бо спадзяецца, што галасы беларускіх працоўных масаў разаб'юцца на 10 роўных частак і тады ясна, на чым баку выгрыш. Частку-б скарыстала польская буржуазія з агульнага разьбіцьця, частку б—атрымалі „бѣлорусы“ і „białorusini“ і толькі невялікую частку запраўдны сьпісак беларускіх сялянска-работн. масаў. Але польская прэса вельмі памыляецца, бо шмат каго пераацэнівае і шмат каго не дацэнівае. Яна верыць у тое, што „паважную“ колькасьць галасоў атрымае банкрот Паўлюкевіч і панок Умястоўскі і думае, што такія здраднікі беларускага працоўнага люду, як Ярэміч і Рагуля разам з хрысьчонымі праваслаўнымі і каталікамі здабудуць нешта. Навет спадзяецца, што й чарнасоценцы ў асобе Р. Н. О. знойдуць сабе прыхільнікаў.

Ну, але калі будаваць такія надзеі, дык можна прысьці да вываду, што Беларускі працоўны люд і ня думае праводзіць у Сойм сваіх прадстаўнікоў.

Толькі—не забывайце панкі з польскае прэсы, што Беларускі працоўны народ вырас у працягу апошніх некалькіх год у вялікага, сьвядомага нацыянальна і сацыяльна гіганта-волата, які скіне ўсякіх прыблудаў, спэкулянтаў і здраднікаў, як непатрэбную гніль з свайго здаровага маладога арганізму і, аддаючы голас за свой сьпісак працоўных — выбярэ адпавядаючы яму лік сапраўдных сваіх прадстаўнікоў-абаронцаў, а ўсе разнабоі, аб якім так мараць розныя панкі і паўпанкі, пойдуць міма яго, не зачапляючы яго навет.

Невядома таксама, што яшчэ будзе з польскай лявіцай. Тая-ж польская буржуазная прэса цешыцца з разьбіцьця сярод п. лявіцы, але толькі выбары пакажуць, за кім ідзе польскі працоўны люд.

Дык перадчасная пацеха польскай буржуазіі скарэй за ўсё разьвеецца, як вясновы туман, разам з вынікамі выбараў.

Але дзеля гэтага неабходна актыўнасьць і консолідацыя пры выбарах працоўных мас, трэба каб кожны працоўны галасаваў за сваю лісту, на якой будуць выстаўлены вядомыя барацьбіты за яго лепшую долю. Трэба, каб самі выбаршчыкі ўмелі з'арыентавацца і не разьбівалі сваіх галасоў дарма.

Тады ня страшны будуць нам пагрозы консолідацыі ў буржуазным лягеры, а пацехі розных панкоў акажуцца прадчаснымі.

Новыя дзяржаўныя сьпіскі.

З чародных нумароў дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў на паслоў ужо паданы: № 7, зложаны N. P. R. (народная работніцкая партыя), № 8 „Сільроб“ (Украінскі сялянска-работніцкі саюз). Нумар 9 выкідаецца згодна з Ордынацыяй выбарчай, каб ня зьмешваць 9 з 6. № 10 атрымала „Stronnictwo Chłopskie“.

Ліцытацыя мандатаў у блёку меншасьцяў.

У свой час мы пісалі, што ў блёку меншасьцяў жыды пастанавілі, каб кожны кандыдат на пасла ўнёс 3000 зл. на справу выбараў. Дык да гэтага часу знайшлося 14 кандыдатаў, якія згаджаюцца ўнясьці навет па 6000 зл. Трэба спадзявацца, што пры наплыве кандыдатаў цана на мандаты ў блёку меншасьцяў яшчэ павысіцца.

У блёку меншасьцяў жыды не задаволены Ярэмічам і ня хочуць яму больш даваць грошы.

Справа ў тым, што Ярэміч спадзяваўся і на грошы жыдоўскай буржуазіі, і як піша

віленская прэса, першая частка грошы былі выплачаны Яроміччу. Але жыдоўская буржуазія глядзіць на рэчы рэальна: далі грошы, але ж трэба паглядзець, каго Яроміч мае заплячыма. І вось на сельсаюзьніцкім зьездзе Яроміч хацеў паказаць сілу, на якую ён апіраецца. Зьезд вышаў няўдалы. Скандалы, грамадзянскія настроі... і іншыя рэчы не спадабаліся жыдоўскай буржуазіі. Яны ацанілі Яроміча з яго ўплывамі і прышлі да вываду, што тавар ня моцны. А раз так — дык купляць такога тавару ня варта, сказалі сабе, і не далі больш грошы. Кажуць, што Яроміч дастаў вялікіх „згрызот“ з гэтай прычыны, галава яму баліць увесь час, навет кампрэсы не памагаюць і што нават ён пахудзеў пасьля гэтага.

Расейскія чарнасоценцы з Р. Н. О. адракліся выступаць у Віленскім вокрузе.

Відаць, няўдалы мітынг у салі Крэнгеля паказаў ім сапраўдную орыентацыю. Трэба спадзявацца, што і ў іншых акругах лёс іх вызначыць такі самы шлях.

Ну і кумпанія!

Старшыня жыдоўскае гміны ў Беластоку п. А. Тыкцін перадаў прадстаўнікам беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам, што да гэтага блёку далучаюцца жыдоўскія ортодоксы, Агуда і саюз уласьнікаў, ці ляпей сказаць, камянічнікі.

Туды ім і дарога...

І яны спадзяюцца.

У Берасьці 11 і 12 студзеня адбылося пасяджаньне Галоўнае Рады Рускага Народнага Аб'яднаньня, на якім ухвалілі выставіць у Сойм і Сэнат свой расейскі сьпісак у надзеі, што за яго будуць галасаваць ня толькі расейцы, але навет... беларусы і ўкраінцы.

Ну што ж, няхай спадзяюцца: надзея— матка дурных.

Гаспадарственыя сьпіскі.

(Listy państwowe).

У Галоўную Выбарчую Камісію ў Варшаве падана 33 гаспадарственых сьпіскі, а іменна: 1) Беспартыйны Блёк Супрацы з Урадам, 2) П.П.С., 3) Вызваленьне, 4) Бунд, 5) Поалей-Сыён, 6) Украінскі Нацыянальны Саюз, 7) Народная Работніцкая Партыя, 8) Украінскі „Сельроб“, 10) Сялянская Партыя (Stronnictwo Chłopskie), 11) Манархісты, 12) Radykalne Stronnictwo Chłopskie, 13) Камуністы, 14) Związek Chłopski, 15) Польская Каталіцка Людовая Партыя, 16) П.П.С.—Лявіца, 17) Жыдоўскае Нацыянальнае Аб'яднаньне, 18) Блёк Меншасьцяў, 19) Єднасьць Сельробу, 20) Расейцы, 21) Н. — Гаспадарственны Блёк Працы, 22) Выбарчы Блёк Украінскіх Сацыялістычных Сялянска-Работніцкіх Партыяў, 23) Związek Siły Chłopskiej, 24) Эндэкі, 25) Plast i Ch.D., 26) Украінская Партыя Працы, 27) Поалей-Сыён (Правіца), 28) Украінскі Саюз „За волю і зямлю“, 29) Камітэт Інвалідаў, 30) Каталіцкая Вунія Заходніх Правінцыяў, 31) Сыёністычны Дэмакратычны Блёк Працы, 32) Самапомач (Сэцэсія „Stronnictwa Chłopskiego“), 33) Агульна-жыдоўскі Нацыянальны Блёк, 34) Дробнароўцы.

Як бачым, усіх нумароў—34, але фактычна ёсьць 33 сьпіскі, бо 9 нумар—прапушчаны, каб не мяшаць з „6“.

Веча „rozbijacza“ і голас сялян.

У нядзелю 15 гэтага студзеня ў Вільні адбыўся зьезд бышага вызваленца, потым бышага сябры Незалежнай Партыі Хлопскай, а цяпер сябры Радыкальнай Партыі Заходняе Беларусі, а і бышага пасла нагул бышага чалавека Шапеля.

Як і патрэбна на зьезьдзе „rozbijacza“— туды былі заклікаты паны і зацягнены сяляне. Паны паставілі на чарод дня высылку тэлеграмы Пілсудскаму, сяляне—прапанавіцыю аб стварэньні камісіі для паразуменьня з арганізацыямі працоўных. Каб ашукаць сялян і падмануць іх на пасылку тэлеграмы— камісія была створана. Але... але Н.П.Х-скі Сабалеўскі пашоў паразумявацца... з буржуазіяй, а з працоўнымі—адмовіўся.

Сяляне, якія ўвайшлі ў камісію, бачучы, што іх кругом абдурылі паны і іх камітэт, злажылі да нашае „рэдакцыі „Oświadczenie“, якое друкуем, як яно падана, у польскай мове:

OSWIADCZENIE

Członków Komisji Porozumiewawczej i Członków Zarządu Głównego Radykalnej Partji Włościańskiej Zachodniej Białorusi:

„Podpisani członkowie Komisji Poroz. i członkowie zarządu R. P. W. Z. B. stwierdzają, że b. poseł Antoni Szapiel członek Komisji Porozumiewawczej pogwałcił wolę Zjazdu z dnia 15/I—1928 r. Albowiem nie zwołując posiedzenie Komisji, na własną rękę wchodzi w układy z innemi partjami, wrogiemi dla interesów chłopskich.

Podpisani potępiają zdradziecką robotę Szapiela, wzywając członków Zjazdu i członków partji do wyrażenia Szapielowi pogardy i do mocnego skupienia się przy nas do walki wyborczej przeciw burżuazji i ugodzie.

Podpisy:

(—) Konstanty Gołubowski
(—) Piotr Hojduk
członk. Komisji Porozum.
(—) A. Rusiecki
członek Zarządu.

Wilno, d. 17/I. 1928 r.

Гэткім чынам з 5 сябраў гэтае камісіі, выбранай на зьезьдзе, 3 — або абсалютная большасьць падпісалася над гэтай заявай.

Падаючы гэта да ведама, рэдакцыя пэўная, што ўсе сяляне і работнікі, якія ашуканчым спосабам былі зацягнены на зьезд, з такой-жа пагардай адняслуцца да панскага грамілы, як і іх выбраньнікі.

Няхай жыве еднасьць працоўных!

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Вялізарнай важнасьці рэформы—шляхам дэкрэту...

Газэты паведамляюць, што ў тых днях мае быць выданы дэкрэт у справе вялізарнай важнасьці адміністрацыйных рэформаў у Рэспубліцы. Дэкрэт мае — перагледзець адміністрацыйны падзел Польшчы на ваяводзтвы, паветы, гміны; -правясьці „аб'яднаньне“ (зн. зам.) адміністрац. уладаў і таксама— прадбачаную Канстытуцыяй дэцэнтралізацыю ўладаў—побач з стварэньнем асобных адміністрацыйна судовых установаў — для кантролю законнасьці паступаньня адміністрацыі.

Праўда, у Канстытуцыі прадбачана яшчэ і тое, што—усё гэта павінен і мае права зрабіць толькі Сойм...

Суд над камуністамі.

Люблінскі Акруговы Суд за прыналежнасьць да К.П.П. па I ч. 102 арт. прыгаварыў Зыгмунта Турскоўскага на 2 гады, а Боруха Кохмана на 4 гады катаргі. Кохман спаткаў прыгавар словамі: „Няхай жыве камунізм, прэч з фашызмам“.

Заграніцай.

Работнікі ССРР далі пазыку ў паўмільёна рублёў англійскім вугляколам.

У пачатку новага году Цэнтральны Камітэт Прафэс. Саюзаў ССРР пераслаў праз англійскія банкі паўмільёна рублёў, як пазыку англійскім гарнякам.

Радавы Ўрад таксама мае—апублікаваць дакументы аб англійскай агентуры ў Кітаі.

Камісарыят заграгічных спраў заявіў, што у хуткім часе мае апублікаваць рад дакументаў, якія сьцьвярджаюць, што ўвесь сучасны процi-радавы рух у Кітаі арганізаваны на англійскія грошы. Дакументы падаюць цэлы сьпісак кітайскіх генералаў, якія знаходзяцца стала—„на службе і на пэнсыі“ англійскага ўраду. Радавы ўрад падасьць точныя лічбы атрымліваных пэнсыяў.

Англійская дывэрсыя на Каўказе.

Як ведама, пасьля паразуменьня паміж турэцкім і англійскім урадамі ў справе Мосульскай нафты, адносіны між Турцыяй і Радамі значна паапсаваліся. Дык англійская агентура мае магчымасьць з значнай вольнасьцяй працаваць на шкоду ССРР на радава-турэцкай граніцы. З Масквы пішуць, што ў Закаўказьзі страшэнна павялічыўся— сярод так-званых „адзэйрбэйджанцаў“ (каўказкіх туркаў, ці „татараў“-мусульман)—процi-радавы рух, страшэнна павялічылася процi-радавая прапаганда.

Удоўж усяго прыгранічча раскідаюцца праклямацыі, якія прадказываюць хуткі канец бальшавіцкай улады, чым заклікаюць скарыстаць—дзеля адарваньня ўсяго Каўказу ад ССРР і — далучэньня яго да Турцыі... Ясна, што тутака працуе англійская рука, якая хоча адцягнуць сюды ўвагу радавага ўраду, скіраваную, здаецца, пільна на англійскую Індыю.

Радава французскія стасункі.

Як цьвердзяць маскоўскія карэспандэнты заграгічных газэтаў, радавы ўрад пастанавіў рашуча—скрануць з мёртвага пункту замершыя свае стасункі з Францыяй. Дзеля гэтага радавы ўрад сьпешна апрацоўвае праграму новых перагавораў з Францыяй, якія мае асабіста распачаць новы пасол ССРР у Парыжу Доўгалеўскі. Як толькі праграма будзе апрацавана, зараз-жа пасол паедзе на свае месца. Радавы ўрад прыдае ў сучасны мамэнт асаблівую важнасьць канчальнаму паразуменьню з Францыяй. Адвак жа ізноў на перашкодзе стаіць, як стаяла, — справа перадваенных даўгоў царскага ўраду, якія, як ведама, прынцыпова ануляваны расейскай рэвалюцыяй...

Трэба думаць, што радавы ўрад неяк пачакае—новых выбараў у Францыі, якія могуць даць больш згаворлівы ўрад... А датаго-ж—і... перагляду „пляну Доўса“ (ў справе сплаты адшкадаваньняў), які значна зьменшыўшы ўплыў нямецкага золата ў французскія касы, таксама павінен зрабіць больш уступлівым французскі ўрад, — якому яшчэ больш, як цяпер, патрэбны будуць радавыя грошы...

На радава-англійскім „нафтавым фроньце“.

Англійскі ўрад забараніў увоз расейскай нафты ў Індыю. Радавая прэса страшэнна абураецца за гэта на англійскі ўрад, які зрабіў гэта — пад націскам ведамага „нафтавага караля Англіі — Дэтэрдынга“... Дый зрабіў пэўне-ж—у адказ на тую „камуністычную“ дый процi англійскую акцыю, якая распачалася ў Індыі, а якую англійскі ўрад цалком прыпісвае Комінтэрну.

Новая хваля „камунізму“ ў Кітаі.

Дзіўная рэч: здавалася ўжо канчальна разгромлены ў Кітаі ўвесь і ўсялякі „камунізм“,—англійская агентура, здаецца, дабілася поўнага выгнаньня ўсіх „радавых агентаў“ з Кітаю; „камуністычныя“ арміі, здаецца, былі канчальна прададзены іх павадырамі імпэрыялістам і пераможаны наймітамі апошніх. Здавалася б, павінны запанаваць у „вызваленым Кітаі“—„тишь да гладь, да Божья благодать“, як кажуць расейцы...

Але ж вось,—у Лёндан тэлеграфуюць з Кантону, што — сталіца паўднёвага Кітаю знаходзіцца ізноў цалком... у руках „камуністычных сялянскіх масаў“. Войскі генерала Лі Ті-Шэна—настолькі слабыя, што нядольны навет утрымаць парадак у месьце. Камуністычныя аддзелы ген. Чанг-Шак-Вэя пасоўваюцца ўсё бліжэй на Кантон, пагражаючы ўжо месту Сва-Тоаў. Места Чау-Чау ўжо ўзята і разгромлена імі, пасьля чаго камуністы пазабівалі ўсіх захопленых жаўнераў арміі правінцыі Шан-Сі. Так кажа тэлеграма. Ці-ж гэта значыць, што ў Кітаі ізноў пачынаецца ўздым таго, што англійскія агенты называюць „камунізмам“, а што прасьцей можна было б назваць—непераможным вызваленчым рухам усяго паўмільярднага народу, якога задушыць ня можна?..

Голас ССРР — у справе польска-літоўскіх перагавораў.

Як мы ведаем, Вальдэмарас рыхтуючыся да перагавораў з Польшчай, усьцяж трымае бліжэйшы кантакт з нямецкім урадам. З другога боку, — няменш заінтэрэсаванай „трэцяй старанай“ у гэтай справе зьяўляецца ССРР. Дык тэлеграма з Бэрліну даносіць, што літоўскі ўрад атрымаў ад толькі-што вярнуўшагася з Масквы радавага пасла ў Коўні Аросева мэмарандум радавага ўраду, датычучы перагавораў Літвы з Польшчай. Зьмест мэмарандуму—пэўне-ж—сэкрэтны.

Перагаворы паміж ССРР і Японіяй ідуць усьцяж.

Дэлегацыя японскага ўраду з графам Гото на чале, якая вяла перагаворы з рада-

Маленькі фэльетон.

Кашмар выбаршчыка.

За вокнамі сялянскай хаты гуляў вольны вецер і гэтак сьвістаў у падстрэшшы, бытцам прадказваў неспакойны сон яе гаспадару.

Ахрэм прыехаў з мястэчка, прадаўшы на рынку возік дроў і зрабіўшы сякія-такія дробныя закупкі.

З пошты ён атрымаў цэлы пук беларускіх і небеларускіх газэт рознага кірунку.

Хутка папалуднаваўшы, ён — як беларус — ведама-ж пачаў чытаць перш за ўсё беларускія газэты, лічучы, што іншыя—гэта проста перадвыбарная агітацыйная „бібула“.

Перагледзеўшы да вячэры колькі нумараў сваіх газэтаў, Ахрэм знайшоў там, апрача звычайных тыднёвых (дайшоўшых да яго ўжо пастарэўшымі) навінаў, яшчэ і той асаблівы тон, які выразна сьведчыў аб адным: Пахла перадвыбарнаю агітацыяй!

І вось, начытаўшыся да познага вечара, Ахрэм заснуў пад пісклівы сьвіст дзікага зімовага ветру.

Ляжыць Ахрэм і сьніць:

— Здаецца яму, што ён на вялікім сялянскім вечы слухае розных агітатараў.

Пра што ж яны гавораць?

А ўсе пра... выбары.

Той кажа:

— Мы вам нанова жыцьцё наладзім.

А той:

— Не!—мы...

І кожны пасвойму гэтае новае жыцьцё малюе.

Першым папрабаваў гаварыць нейкі пан з „Крэёвэго Строньніцтва Людовэго — Зьедночэньне“. (Цяпер ўжо — гэта частка Bloku Współpracy z Rządem).

— Мы вам,—кажа, — зробім аўтаномію, каб зямля ваша ня была „крэсамі всходнімі“ ды ў Вільні зьбяром Сойм тутэйшы, дзеля таго, што ўсе-ж мы, браточкі,—краёўцы...

— Не! Мы—беларусы!—дружна загуло ўсё веча.

— Годзі ўжо нам слухаць розных панскіх строньніцтваў людовых! — пачуліся галасы.

Аратар, гаварыўшы папольску, зразумеў, што трапіў не ў свае сані, разьвёў безнадзейна рукамі і зьлез з трыбуны, якою служыў звычайны сялянскі воз.

На ратунак гэтаму пану выскачыў новы, адрэкамандаваўшыся вечу, што ён прысланы ад нейкае „Беларускае Радыкальнае Народнае Партыі“.

— Паночкі, грамадзяне, браточкі вясковыя,—трапятаўся ён:

— Вось і мы таксама за аўтаномію... Нас душыў цар... А цяпер мы ў Польшчы ўсё, усё будзем мець... І Сойм у Вільні... Але, але... Вось як... Дык усе разам, паночкі, усе, адным людовым Зьедночэньнем галасуйма, як адзін...

— І гэты з „Зьедночэньня?“—спытаўся магутны голас аднекуль з самае гушчы веча.

Аратар замітусіўся крыху, пасьля пачаў дрыпаць ізноў!

— Але, але, браточкі, так... так—мы разам... Зьедночэньне...

Далей ужо яму гаварыць не ўдалося.

Зусюль, як гарматнія кулі, ляцелі неспакойныя воклікі:

— Раней „Вызваленьне“, а цяпер, дык ужо „Зьедночэньне?!“

— Не ашукаеце!!

— Далоў!!!

— Годзі!!!

— Хай іншы кажа!!!

„Беларускага“ радыкала зьмяніў высланец „Беларускай Хаткі“ і яе ваколіцаў.

— Понимаете?—спытаўся ён.

— Маскаль!—гукнуў нехта.

— Нет!!! не! Не маскаль!—агрызнуўся аратар.

— Я—бѣлоруссъ! І по-бѣлорусски я вам, братцы, скажу:

— Мы нічога ня маем процi „Зьедночэньня“, але-ж гэта—вещь нерэальная. Вось мы, дык новы парадак завядзём. Галасуйце за нас, дык понимаете — ня толькі ў кожным павятовым месьце, а ў кожным мястэчку ў ігру сьветльно-колёровую гуляць пачнём. А дѣло это выгодное. І сьветла ж тады ў нашай Беларусі будет! Не дарма мы яшчэ і „Прасьвету“ свою маем... А „Хатку“ нашу беларускую хто мае?

Мы.

А „Рада Нацыянальная“ дзе?

У нас.

А справы самаўрадаў хто рашае?

Мы.

А „партыя“ наша Нацыянальная дзе?

У нас, у „Хатцы“.

А „Беларускае Слова“ з ілюстрацыямі хто выдае?

Мы.

Это ничего, что мы его тульскім нарѣчіем бѣлорусскаго языка пішам:

Навучымся.

А русскій національный герой Кавэрда дзе выгадзваўся!

У нашай „Хатцы“.

— Ха-ха-ха-ха! — зарагатала ўсё веча, весела слухаўшае дасюль скамароха з паўлюкевічаўскае „батлейкі“.

Сьмех быў такім агульным і такім заразьлівым, што навет і Ахрэм-выбаршчык некалькі разоў праз сон хіхікнуў.

А паяц наш, расхварбаваўшы ўжо, наколькі мог, усё сваё партыйнае пер'е, пачаў зьбіваць ранейшага аратара („беларускага“ радыкала разам і зьедночэньца):

— Вось цяпер пра гэтага радыкала, братцы, хачу сказаць.

Дзе яго партыя?

У Вільні на Ціхай вуліцы?

У „Беларускім Дні“?

Дык там толькі пан Умястоўскі, а партыя—гэта „фахова зьяздовічэ“, як пісалі ў адной польскай газэце ў Вільні. Хітруны, понимаете. Залажылі „Беларускі Дзень“, засадзілі ў сваёй рэдакцыі стэрорызованых голадам: аднаго пісьменьніка, некалькі студэнтаў і аднаго... чорт ведае каго—дый дураць галаву. І нам мешают. Хай сабе пісалі-б пра гаспадарку, а нам конкурэнцыю палітычную нашто рабіць?

— Ха-ха-ха-ха-ха!—разьлеглось па ўсім вечы з новаю сілай.

А шут наш, у прыступе агітатарскага натхненьня, гатоў быў зусім загрызьці свайго конкурэнта, якога, праўду кажучы, на вечы ўжо і сьледу ня было.

— Гаспада!—гукнуў сьветльно-колёровы аратар.—Ды хіба ж гэта радыкал? Які ён радыкал?... Ен акцызьнік. „Табакі“,—піша ў „Беларускім Дні“—ня сей, бо будзе штраф“. А сам колькі пратаколаў напісаў на сялян вакол Вільні ды ў Ашмяншчыне?!

Тут нейкая фігура, туліўшая дасюль нос у коцікавым каўняры чорнага пальта, падышла да аратара і выразна дала зразумець, што ён ужо задалёка залез.

— Дык понимаете, братцы, — закончыў паўлюкевічавец,—галасуйце за нас единым і недѣлимым нацыянальным фронтам. Бо нацыя беларуская—гэта мы, наша „Беларуская Хатка“.

Пасьля вясёлага шута на воз залезла сыценькая фігура „сельсаюзьніка“, які адрэкамандаваўся, што ён будзе гаварыць ад „Цэнтральнага Аб'яднанага Беларускага Каталіцка Праваслаўнага Выбарнага Камітэту“.

— Мы ўсіх, усіх вас да сябе пад стрэху заклікаем,—пачаў аратар,—бо мы — вось якія... паглядзеце. Мы ня выдумваем новых шляхоў, а блёк творым з усімі нацыянальнымі меншасьцямі...

— З буржуямі!—голасна дадаў нехта з натаўпу.

— Якая-ж мы тут меншасьць? — зьдзівіўся другі.

А прамоўца, напружыўшы ўсю сілу свайго слабенькага сельсаюзьніцкага голасу, проста пачаў крычаць:

— Я быў паслом, дык ведаю, што казаць! Вы мяне не перабівайце, а я вам усё і раскажу!!!

— Чулі!!!

— Чыталі! не ашукаеш!—ляцелі зусюль дружныя галасы.

— На нашай працы адсыцець яшчэ больш хочаш! З расейцамі хаўрус вядзеш, з бышымі губэрнатарамі!!! Годзі! Злазь!

Махнуўшы безнадзейна рукою, пачаў злазіць з воза і „сельсаюзьнік“.

Цяжка было яму спушчацца на грэшную зямлю, але ніхто не памог...

Ахрэмаў кашмар тут перарваўся, бо над ім ужо ўсапраўднасьці стаяў сусед яго Ігнат:

— Уставай, Ахрэм. Хадзем на веча. Тут нашы з Вільні прыехалі...

— Вось яно як? — спытаўся сам сябе Ахрэм,—а то ж мне праз усю ноч розная погань у мазгох круцілася: ўсё аратараў розных сьніў... ды ўсё-ж яны вядомыя... Раскажу па дарове...

Ахрэм апрануўся, закурыў і, глянуўшы ў вакно, пераканаўся, што за ноч пагода вярнулася:

За вакном іграла зімовае сонца.

Я. М.

вым урадам у справе палітычнага і эканамічнага зблізканьня з Радамі дып мейшая ўжо выехаць дамоў—з прычыны неласьлеку перагавораў, — рантам асталася ў Маскве—на неазначаны тэрмін. Мела яна выехаць—бо радавы ўрад рашуча адмовіўся спорыць залішне вялікія дамаганьні Японіі—у справе падзелу ўплываў у Манчжурыі і Мангоаліі, а таксама — у справе розных канцэсіяў для Японіі на абшары СССР на Далёкім Усходзе.

Як ведама, абодвы краі прыладаць вялікае значаньне гэтаму збліжэньню і распачатым перагаворам, спадзяючыся на іх займаць ня — японска-радавага саюзу. Можа, у бліжэйшы час так далёка не зайдзе, у кожным разе факт, што японская дэлегацыя асталася ў Маскве, каб вясьці далейшыя перагаворы, сьведчыць аб тым, што абедзьве стараны зацікаўлены ў паразуменьні.

Пратэст французскіх левых радыкалаў проці гвалтаў Амэрыкі ў Нікарагуа.

Цэлы шэраг добра знаных і нашым беларусам—з іх пратэстаў проці „белага тэрору ў Польшчы" — французскіх жэва-радыкальных палітычных і літэратурных дзеячоў выслалі ў Гаванну—па адрэсу „Усе—Амэрыканскай Канфэрэнцыі" пратэст—проці імпэрыялістычнай акцыі Злучаных Штатаў у Нікарагуа і гвалтаў над вольнасьцяй гэтай незалежнай рэспублікі.

Ваенная рэформа ў Ірляндыі.

Ірляндзкі ўрад унёс у парлямент праект—рашучых зьмен у лічбе і арганізацыі краёвай арміі. Армію пастаноўлена зьменшыць да мінімуму (наймешнай лічбы) — у 4.000 жаўнераў.

Чынная служба ў войску будзе трываць толькі 1—3 месяцы; пабыт у рэзэрве—6 гадоў — у веку ад 18 да 34. Рэшта патрэбнай для падтрыманьня парадку ў краі, арміі будзе рэкрутавацца з ахвотнікаў—у масовых вайсковых фармацыі, у якіх будзе ўсяго—не больш, як 12.000 жаўнераў. Гэткім чынам значна зьменшацца кошты ўтрыманьня арміі, а імення — з 2 мільён. фунтаў (10 мільёнаў даляраў) — да паўтара мільёна. Шчасьлівы край, які—дзякуючы свайму палажэньню на востраве і сваёй мірнай палітыцы—можа не перашкаджаць сваім грамадзянам—займацца прадукцыйнай працай.

Дэманстрацыйныя—проці-англійскія — маніфэстацыі ў часьць афганскага эміра ў Індыі.

Як ведама, афганскі эмір (кароль) з сям'ёй выехаў з краю—у падарожу навакол сьвету—сябе паказаць ды на людзей наглядзець. Едучы ў Эўропу, дзе ён цяпер аглядае не пуды ды дзівы, эмір Аман Улла заехаў у Індыю. І вось—дзіўная рэч—яго праезд праз усю Індыю—да самага Бомбэю—ператварыўся ў адну суцэльную дэманстрацыю індыйскага нацыяналізму, скіраваную проці ўладаў англійскіх захватчыкаў. Нязьлічаныя сьцягі розных нацыянальных—індускіх і магамэтанскіх — арганізацыяў захоплена віталі афганскага караля, як галаву вольнага (ад чужаземнага—англійскага—ігу) народа... Адказваючы на гэтыя прывітаньні, афганскі народ казаў—аб роўнасьці ўсіх народаў, аб іх праве на самаазначэньне і вольнае развіваньне сваіх лёсаў, аб неабходнасьці—злучэньня ўсіх народаў у адзіную сям'ю, а—у часьці—злучэньне Індыі з Афганістанам, які ўжо здабыў сабе волю і незалежнасьць... У некаторых месцах маніфэстацыі збіралі да паўмільёна людзей...

Цікава, што і тутака, як мы ўжо адзначалі, — індусы злучыліся ў адно з сваімі нядаўнымі сьмяротнымі ворагамі (нацкаванымі англійскай правакацыяй) — магамэтанамі.

Англійскі віцэ-кароль—„з прычыны хваробы" — ўсьцяж быў адсутным у часе ўсіх гэтых урачыстасьцяў, якія гэткім чынам былі—чыста народнымі. Тое ж рабілі — рантам „захварэўшыя" ўсе прадстаўнікі англійскіх уладаў у Індыі. Толькі ў Бомбэі англійскі губэрнатар прыняў учасьце — у пажагнальным банкеце ў часьць караля — радуючыся, відаць, што — пазбыліся нарэшце непажаданага госьця.

Прэса адзначае, што афганскі кароль зьдзівіў усіх—сьмеласьцяй і шчырым дэмакратычным зьместам сваіх прамоваў, кажучы паўсюдных—аб неабходнасьці—шырокіх дэмакратычных рэформаў на карысьць масаў працоўнага народу...

Недарма, відаць, прайшоў ён школу ў сябе ў краі, у якім ўсьцяж крыжуюцца ўплывы — радавыя з англійскімі...

Воучы білет самазваннаму редактару-выдауцу „Нашае Долі“ — яснавяльможнаму „пану графу“ Францішку Умястоускаму.

Як і трэба было спадзявацца, пан Францішак Умястоўскі, самазваны рэдактар-выдавец „Нашае Долі“ 1906 г., прачытаўшы нашае пісьмо ў № 3 „Права Працы“, пайшоў вайною проціў нашае заявы: што ён самазванец, а не рэдактар выдавец першае рэвалюцыйнае газэты „Наша Доля“.

Зусім зразумела, што калі праўды сваёй пан Умястоўскі выказаць ня можа ніякім спосабам — пробуе ён лаянкай і закідамі, што быццам-бы яго праціўнік нічога ня мае супольнага з беларускім рухам, апэцкаць свайго ворага і хоць-бы фальшыва падтасаванымі фактамі ды нанятымі за грошы сьведкамі надкапаць відавочную праўду.

Стацьця пана Умястоўскага ў яго-жа польска-панскай газэце ў беларускай мове „Беларускі Дзень“ № 40 пад загалоўкам: „Праўда аб рэдагаваньні „Нашае Долі“ ёсьць тыповым прыкладам езуіцка-шэльмоўскага крупельства і хлусьні ды надта ярка малюе маральны воблік гэтага панска-дэфэнзыўнага „дзеяча“. А калісь-то пан Умястоўскі быў навет сацыялістам ды яшчэ і рэвалюцыянэрам! Вось да чаго вядзе людзей хцівасьць на грошы і матэрыяльную нажыву!

У нашым пісьме ў рэдакцыю „Права Працы“ мы лаянкі ня ўжывалі, а мусілі толькі факт прысваеньня сабе чужых заслуг назваць па імені: самазванствам!

Як гэта пан Умястоўскі, вучань русыфіката Брянцэва, „выдумвае сам факты“ ды яшчэ чаго не рабіў яго вучыцель, як шукае падкупных сьведкаў,—высьвятлім падрабязна.

Мы добра разумеем, што пану Умястоўскаму ў інтарэсах яго партыі „Zjednoczenia“, якой пагражае правал на выбарах, ляжыць пад нацьце свайго ўласнага аўрэолю, наказаньне сябе за старога змагара за свабоду Беларусі і ўпэўненьне выбаршчыкаў, што толькі ён, дзякуючы сваёй змове з панамі, павядзе „дурны“ сялянскі народ на шлях волі, свабоды ды... панскае ласкі. Дык ня дзіва, што стараецца ён выбеліць сябе ды абліць чорнымі памыямі нечаканага ды непажаданага праціўніка, які пэўне псуець яго пазіцыю ў буйных паноў і ўва ўсемагутнай дэфэнзыве.

Дык з дакумэнтамі ў руках разьбярэм па костачках яго крывадушныя вывады.

Наш пан самазванец кажа, што заўсёды прыпісваў сабе рэдагаваньне „Нашае Долі“, бо аб гэтым пісаў навет у газэце „Беларусь“ (Менск 1919 № 47). Як жа можа хто колечы даць яму веру, калі ўсе надрукаваныя дагэтуль весткі яўна і станоўча гэтаму пярэчаць! Пан Умястоўскі запэўняе, што яго стацьцю чытала граматная Беларусь ды ў працягу васьмі гадоў ніхто яму не запярэчыў! На-што тут „валять дурака“, калі пан Умястоўскі, як беларускі „дзеяч“, ня мог ня чытаць у Вільні кніжак, у каторых сказана ясна, што рэдактарам выдаўцам „Нашае Долі“ ён ня быў.

Вось гэтыя кніжкі:

Памяці Івана Луцкевіча ў першыя ўгодкі сьмерці яго. Вільня 1920 г. Максім Гарэцкі: Гісторыя беларускае літэратуры. Вільня 1920 г.

Дык запярэчаньні былі — і проціў іх тады пан Умястоўскі в пратэстам ня выступіў. Так на што-ж цяпер лгаць?

Пойдзем далей. Пярэчаць „праўдзе“ пана Умястоўскага і ўспаміны сябра рэдакцыі „Нашае Долі“ Аляксандра Бурбіса. Успаміны гэтыя надрукаваны ў Менску ў 1924 г. Таксама пярэчыць нашаму самазванцу і прафэсар У. Ігнатоўскі ў сваёй кнізе: Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX ст. Гэта ў кніжках.

У газэтах, тыднёвіках ды месячніках запярэчаньні „праўды“ пана Умястоўскага можа знайсьці:

1. Ал. Шлюбскі, Канфіскацыя першай беларускай часопісі „Наша Доля“ — (Савецкая Беларусь, Менск 1923 г. № 150).
2. Ал. Шлюбскі, Да Гісторыі канфіскацыі „Нашае Долі“ (Звезда, Менск 1926 г. № 210 і Савецкая Беларусь, Менск 1926 г. № 208).
3. А. С., Да юбілею „Нашай Долі“ (Звезда, Менск 1926 г. № 210).
4. Самцэвіч В., Праз 20 год. (Савецкая Беларусь, Менск 1926 г. № 208).
5. Смоліч А., Да юбілею „Нашай Долі“ (Савец. Беларусь, Менск 1926 г. № 208).
6. Сянкевіч А., Шэсьць нумароў, (Савецкая Беларусь, Менск 1926 г. № 208).
7. Езавітаў К., 20 ыя ўгодкі легальнае беларускае прэсы, (Голас Беларуса, Рыга 1926 г. № 38).
8. Ш.-Тр. Р. (Шукевіч-Трацьцякоў), „Наша Доля“, (Беларуская Вёска, Менск 1926 г. № 99).
9. Ал. Шлюбскі, Новыя матэрыялы да гісторыі „Нашае Долі“. (Полымя, Менск 1927 год № 3 стр. 199—206).

Вось гэтак выглядае нашая праўда! Бо няўжо-ж бы столькі людзей ды яшчэ: Антон Луцкевіч, Аляксандар Уласаў, Рамуальд Зямкевіч, Вацлаў Ластоўскі ды Эдвард Будзька гаварылі аднагалосна няпраўду?

Дзіву можна дацца, як можа гэтак яўна лгаць пан Умястоўскі!

Грошы на выданьне „Нашае Долі“ даў у 1906 годзе Іван Тукеркес. Калі паказалася, што газэту купляюць „на расхват“, што газэта дае даход, бо навет усе кошты вярнуліся з лішкам, дык Тукеркес, як добры камэрсант, хацеў з газэты цягнуць даход для сябе. Ідэйныя сябры з кальлегіяльнае рэдакцыі проціў гэтага запратэставалі. Баючыся, каб грошы за падпіску, каторыя ўсьцяж падсылалі з правінцыі, ня браў сабе Тукеркес, каллегія рэдактараў ў № 2 „Нашае Долі“ надрукавала вось якую заяву:

„Усялякіе грошы, прысыланыя ў Рэдакцыю „Нашае Долі“, просім прысылаць канешна на імя Ефстафія Сымановіча“.

Гэты „Ефстафі Сымановіч“ быў экспэдытарам „Нашае Долі“, а не Станіслаў Сымановіч, які, хоць на яго гэтак ласкава (мусі быць за грошы!) паказвае пан Умястоўскі і дае яго адрэс (Вільня, Полацкая вуліца 7 кв. 2), ёсьць хіба толькі купленым сьведкаю і такім самым самазванцам і правакатарам, як і наш „знамяніты дзеяч“ — чорнасоценна-панскі, і сам пан,—Францішак Умястоўскі!

Сьведкі, на якіх хоча апірацца пан Умястоўскі і на якіх паказвае — саўсім у рэдакцыі „Нашае Долі“ не працавалі і ў ёй ня пісалі. Дык гэтыя „жывыя сьведкі“ ня могуць сьведчыць у тым, чаго ня бачылі.

А што датычыць „сьведкі“ пана прафэсара Вацлава Іваноўскага — дык паказваць гэткага сьведку проста, ня тут кажучы, і... стыдна і нязручна! Гэта нягодны здраднік Беларусі і беларускае справы! Належыць ён да гэтых „маскарадных кірмашовых беларусаў“, якія калісьці былі ў беларускім руху не дзеля запраўднае ад душы і сэрца ідэі, а толькі дзеля забавы і сьмеху, а — магчыма, і дзеля скрытае шкоды беларусам.

Паказаны сьведка Эдвард Будзька ў 1906 годзе захадзіў у рэдакцыю „Нашае Долі“, бачыў у ёй, як пан Умястоўскі рабіў карэктуру, але каб лічыў яго рэдактарам, дык гэтага не пасьведчыць.

Аднак, каб памагчы пану Умястоўскаму ў сьведках, мы яму парадзім зьвярнуцца яшчэ да вось якіх колішніх „маскарадных беларусаў“:

1. Вітольд Чыж, (ён жа: Гідальго, Чыжык Ашмянскі, Еленскі, Альгерд Бульба), цяперашні віцэ-прэзыдэнт места Вільні;
2. Язэп Манькоўскі, (ён жа: кірмашовы паніч, Янка Окліч), дырэктар хаўрусу ўласьнікаў кінэматаграфаў у Варшаве.

Мы пераконаны, што гэтыя паны выручаць свайго сябру пана Умястоўскага з бяды, напішуць і надрукуюць свае заявы ў панскіх газэтах і сваімі ўплывамі і „магутнай“ пратэкцыяй абароняць „асобу“ самазванца ад прыкрасьцяў пасьля правалу на выбарах яго беднага „Zjednoczenia“.

З гісторыі выдавецтва „Нашае Долі“ можам адмеціць яшчэ адзін важны факт, што ў часе спораў за грошы з Тукеркесам,—казначэем—касірам (скарбнікам) газэты быў пан Францішак Умястоўскі. Пасьля неспадзяванага выезду з Вільні пана Умястоўскага, захапіўшага з сабою... усю гатоўку касы, адносіны з Тукеркесам гэтак завастрыліся, што па 4-м нумары газэты каллегіяльныя рэдактары „Нашае Долі“ пастанавілі газэту закрыць, аб чым жа і надрукавалі ў гэтым-жа нумары заяву. Тут прыйшло да лаянкі: Тукеркес у газэце „Северо-Западный Голос“ — (Вільня 19.X 1906 № 261) апавясьціў, што газэту не закрывае, а падпіску прыймае далей. На заяву Тукеркеса ўсе сябры рэдакцыі „Нашае Долі“ адказалі ў той-жа газэце „Северо-Запад. Голос“ (Вільня 21.X 1906 г. № 263), што яны з Тукеркесам працаваць ня будуць і што газэта закрыта. Спор быў закончаны лістом Тукеркеса ў газэту: „Свободное Слово“ — (Вільня 14.XI 1906 г. № 143), у каторай ён лае ўсіх — ды найбольш самога Ф. Умястоўскага (пэўне за вываз касы газэты).

Гэтак сьведчаць факты „друкаваныя“, проціў каторых выдуманыя факты пана Умястоўскага нічога ня зробяць.

Аб „захапленьні“ грошы „Нашае Долі“ праз пана Ф. Умястоўскага надрукавана нядаўна і ў месячніку „Полымя“ (Менск 1927 г. № 3).

У гэтым-жа месячніку сцьверджана, што пан Ф. Умястоўскі да Беларускае Сацыялістычнае Грамады не належаў. Чаму Суд судзіў Ф. Умястоўскага за належнасьць да Сацыял Дэмакратычнае Партыі, а не да ППС.—мы ня ведаем.

Мэтай нашай была аб'ектыўная гістарычная праўда, а не грашавыя інтарэсы. Мэтай жа пана Умястоўскага ёсьць ня ідэя, а нажыва.

Ацэніваць факты нам ня трэба, яны лішне ясны і само беларускае грамадзянства ацэніць іх і зробіць свае вывады!

Мы-жа нашымі фактамі даемо пану Ф. Умястоўскаму воўчы білет — гэтак патрэбны яму на выбарах. Спадзяёмся, што беларускія сялянска-работніцкія гушчы пазналіся і пазнаюцца на ім і скажуць яму славамі нашага слаўнага Мацея Бурачка: „Скінь скурку, дабрадзею, бо зубкі відаць!“

Саўка Барывой.

Вільня, 10 студня 1928 г.

Ад Рэдакцыі: Зьмяшчаем гэтую карэспандэнцыю для высьвятленьня праўды, але нам куды важней паказаць „працу“ п. Умястоўскага цяпер. А аб ёй беларускія працоўныя гушчы ўжо даволі ведаюць.

Канец Умястоўшчыны.

Гэтак-званая „Беларуская Радыкальная Народная Партыя“, заснованая спэцыяльна на час выбараў вядомым цяпер польскім акцызьнікам Ф. Умястоўскім, кончыла сваё істнаваньне. У суботу 21 г. студзеня гапасьлівае „Zjednoczenie“ ўліліося разам з Умястоўскім у толькі што народжаны „Bezpartyjny Blok Współpracy z Rządem. Такім чынам — Умястоўшчына растапілася ў сваей уласнай вадзіцы.

Вось дзе „аўтаномія“ п. Умястоўскага і Гурына!

Цікава, што навет самі паважнейшыя палякі з „Zjednoczenia“, якія былі няменшымі грачамі пры яго („Zjednoczenia“) твораньні, якто б. пaслы — Галка, Дуброўнік і Вендзегольскі,—пасьля бурлівых дэбатаў, пакінулі сваё былое дзіця, адходзячы ў бок з агідай да „беларуса“ Умястоўскага, які так лёгка разьвітаўся з выстаўленай ім перад гэтым „ідэяй згоднага сужыцьця братніх народаў“. Прыходзіцца дзівіцца наіўнасьці б. паслоў, бо, як радыкальная беларуская прэса заўсёды пісала, для Умястоўскага справа была і ёсьць ня ў сужыцьці, а ў службе!

Перадаюць, што правінцыянальныя агенты п. Умястоўскага асталіся ў роспачы ад пастановы „шэфа“, ня ве[illegible]ы, што сказаць на прыезьдзе людзям, я[illegible] да тога абманвалі яшчэ нейкаю ілюз[illegible]ьці, ня ведаючы, што чыноўнік пера[illegible] мусіць служыць!

Вось-жа яшчэ аднэй прадвыбарнай крамкай на беларускіх палетках стала менш!

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у Вашай паважанай часопісі „Думка Працы“, дзеля наданьня да ведама ўсяго беларускага грамадзянства, што я лічу сябе даўно выйшаўшым з палітычнай партыі Умястоўскага, куды папаў, дзякуючы таму, што лічыў яго запраўды старым беларускім дзеячом і рэдактарам „Нашае Долі“. Я быў на адным з яго зьездаў, але ніякага ўдзелу ў ім ня прымаў, як таксама ў прыняцьці рэзалюцыі на ім. Заехаўшы дамоў, я даведаўся, што мяне назначылі без майго ведама нейкім прадстаўніком на правінцыі. Сам я ня лічыў сябе нічым зьвязаным з партыяй Умястоўскага, бо маёй сьвятыняй была і будзе на першым пляне культурная праца дзеля адраджэньня свайго Беларускага Народу!

З пашанай **Міхась Косьцевіч.**

2./I. 1928 г.
в. Баброўня.

Ад Рэдакцыі. М. Косьцевіч вядомы шырэйшай беларускай публіцы, як паэта Міхась Васілёк, вершы якога ў апошні час можна было спаткаць амаль ува ўсіх беларускіх часопісях. Зьмяшчаючы гэтае пісьмо, Рэдакцыя шчыра вітае папулярнага паэту і бачыць у яго заяве аб адыходзе ад шайкі панскага найміта адзнаку шырэйшага ацьверазеньня беларускай інтэлігенцыі ад туману неразборлівасьці, які акутаў яе і дагнаў навет да паколаў панскіх лёкаяў.

Хай-жа будзе гэтае пісьмо першым асінавым калом у гроб Умястоўшчыны!

Далейшы развал Паўлюкевічаўшчыны.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва просім зьмясьціць у вашай газэце „Думка Працы“, наступнае:

Мы ніжэй падпісаныя, бyўшыя сябры Таварыства „Прасьвета“ і Беларускай Нацыянальнай Рады, т. е. арганізацыі Паўлюкевіча, пераканаліся, што гэтыя арганізацыі ня ёсьць арганізацыі працоўнага люду, каторыя-б баранілі і змагаліся за лепшую будучыню і каторыя б баранілі нашы інтарэсы.

А цяпер добра зразумелі, што Т-ва „Прасьвета“ і Белар. Нацыянальная Партыя ёсьць арганізацыі абшарніцкія, і Паўлюкевіч— найміт панскі, і хоча ашукаць вёску за панскія грошы, бо дае-ж бы ён узяў столькі грошаў, каб наняць сабе агентаў, якія езьдзяць па вёсках, як Гарбун з нашай ваколіцы, каторы пад рознымі хітрасьцямі заманваў нас запісацца ў Т-ва „Прасьветы“ і Белар. Нац. Рады. Мы добра зразумелі, што Гарбун за кожнага, хто толькі запішацца ў Т-ва „Прасьвета“ праз яго ласку, — бярэ грошы і, як Юда — проста прадае людзей у вочах усіх працоўных.

Заклікаем усіх чэсных грамадзян зрабіць гэта самае: выступіць з партыі і ўсіх арганізацыяў Паўлюкевіча.

Пры гэтым далучаем свае білеты за нумарамі: 176, 175, 172 і 180.

З пашанай: **Уладзімер Пухоўскі, Міхаіл Хрышчановіч, Юльян Хрышчановіч і В. Хрышчановіч.**

в. Гезгалы, Бяліцкай вол., Лідзкага пав.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу не адмовіць надрукаваць у Вашай газэце „Думка Працы“ наступнае:

Спачуваючы роднай беларускай культуры і асьвеце, мы, моладзь в. Морач, Заастравецкае гміны, калі прыехаў да нас п. Шыбут і сваімі салодкімі славамі нас затуманіў, (ведама, што кожнаму цяпер хочацца сьвету), запісаліся да „Прасьветы“, як да культурнае і асьветнае ўстановы, добра не разабраўшыся, што робім вялікую памылку. Ажно нарэшце высьвятлілася, што пад відам „Прасьветы“ нас уцягваюць у сваю, нам ня мілую, палітыку. Цяпер нам стала ясна, што гэта за „Прасьвета“ і я, як бышы старшыня і ўсе сябры Аддзелу выступілі з гэтае „Прасьветы“, тым ліквідуючы Аддзел „Прасьветы“, як нам не патрэбную шкодную і ня мілую. На другі раз будзем асьцярожны.

Іншыя газэты прашу перадрукаваць.

З пашанай: **Рыгор Рудко,**

У рэдакцыю надыйшла адозва гэткага зьместу:

Браты Беларусы!

Я — старшыня Паўлюкевічаўскага гуртка „Прасьветы“ ў Баранавічах на рынку, за ўвесь час існаваньня гэтае „Прасьветы“ прыйшоў да моцнага пераканаьня, што ўсе Паўлюкевічавы арганізацыі існуюць на фальшывых нагах, каб уцягіваць на нейкі час усё новых і новых асоб, карыстаць з іх, бэсьціць усіх Беларусаў, а потым зноў шукаць новых і новых ахвяр дзеля сваей грашовай нягоднай працы, ад каторай Беларускі Народ можа мець столькі карысьці, сколькі ад казла малака. Затым усе тыпы, што згуртаваліся каля Паўлюкевіча, ведаюць толькі адно: піць гарэлку і ўсіх і ўсё Беларускае паганіць.

Паўлюкевіч, як ведама, чарпае грошы з цёмных крыніц і за гэтыя грошы хоча крывавым потам Бел. Народу прайсьці ў Сойм, каб стаць паважнейшым, бо яму грошы даюць, але рукі не падаюць.

Я перакананы, што Паўлюкевіч і ўся ягоная бліжэйшая кумпанія — гэта заядлыя расейцы манархісты, нічога ня маючы супольнага з Беларускаю Думкаю, а Шыбут, Конан, Абрамчык і інш., што сядзяць цяпер у „Прасьвеце“ ў Баранавічах, — гэта проста правакатары!

Дык Беларусы, у каго яшчэ асталося хоць крыху сумленьня, павінны парваць усе свае зносіны з арганізацыямі Паўлюкевіча, а яго самога, дзе-б ён не паявіўся, належыць гнаць ад сябе, як дакучлівую, нахальна—злую муху.

І ўсіх грамадзян, каторых несьвядома я ўцягнуў у „Прасьвету“, думаючы, што гэта ўзапраўдная беларуская прасьветная ўстанова, вельмі гэтым перапрашаю і тых, каторых яшчэ можа асталіся сябрамі „Прасьветы“, заклікаю пайсьці за маім прыкладам, пакуль яшчэ ня позна, бо ўсіх Вас спаткае вялікае расчараваньне і няпрыемнасьць ад паўлюкевічаўцаў...

У гэтым самі пераканаецеся,—за што я не хачу нясьці адказнасьці.

Здраднік-здраднікам назаўсёды і застанецца! Няма яму месца сярод Белар. Народу!

Янка Шулейка.

Ад Рэдакцыі: Зьмяшчаючы гэтую адозву, якая ўва многім дае запраўдную характэрыстыку шулерскай банды — Рэдакцыя засьцерагае, што падпісаўшы гэтую адозву ня мае нічога супольнага з рухам працоўных беларускіх гушчаў, а, як відаць, ідзе з новай нам ня ведамай камбінацыяй Міткевіча, аб якім будзе далей. Падаем гэта да ведама, як цікавае зьявішча поўнага распаду Паўлюкевічаўскае банды.

Рэдакцыя мае яшчэ пісьмо Янкі Башаркевіча, у якім ён, адкідаючы закіды карэспандэнта нашае газэты, аб працы з Паўлюкевічам, заяўляе, што „не прадаваў сумленьня на мінулых выбарах, што не прадасьць і на гэтых за юдашавыя грошы“.

———

Такім чынам, нашае глыбокае перакананьне, што ніхто з сялян ня йшоў з арганізацыямі Паўлюкевіча шчыра — апраўдываецца ў поўнай меры. Вітаем гэтыя шагі сьвядомасьці беларускіх працоўных гушчаў.

Наша хроніка.

З Сялянска-Работніцка Аб'яднаньня“. Як нас паведамляюць — Выбарны Камітэт Сялянска-Работніцкага Аб'яднаньня будзе выстаўляць свае лісты толькі на Акругах. Праз тыдзень абяцаюць даць нумары, пад якімі яны будуць ісьці ў паасобных Акругах.

Зацьверджаньне канфіскаты. Акружны Суд у Вільні на паседжаньні 4./І. 1928 г. зацьвердзіў арышт, наложаны на аднадзёўку „Новагодняя Праца“.

Беларуская тэатральная трупа Галоўнае Управы Т-ва Беларускае Школы—карыстаецца вялікім пасьпехам на правінцыі. Выехала яна ў Слонімскі і Беластоцкі паветы, дзе спатыкаюць яе з захопленьнем. Трупа працуе пад кіраўніцтвам артыста Міхалевіча. Дала яна ўжо шмат спэктакляў. Справаздачу аб працы дамо пазьней.

Спэктаклі-вечарыны ў Народным Доме Т-ва Беларускай Школы. У суботу 14-га студзеня Новасьвецкім Гуртком Т-ва Белар. Школы пастаўлен быў спэктакль, на якім пад кіраўніцтвам А. Мітрафанава згуляна п'еса Ф. Аляхновіча — „Птушка шчасьця“. Артысты — Эма Залкінд, Аляксандар Іваноўскі і Аляксандар Смолік справіліся з сваімі ролямі вельмі ўдала.

21-га студзеня тым-жа Новасьвецкім Гуртком Т-ва былі пастаўлены п'есы „Чорт у бочцы“—камэдыя ў 1-м акце ў перакладзе з украінскае мовы — і „Хоць раз яго праўда“ — камэдыя ў 2-х актах у перакладзе з украінскага. Чынны ўдзел у абедзьвюх п'есах прыймалі — Э. Залкінд, М. Сіняўскі, Л. Лявонава, А. Тарасаў, А. Іваноўскі, А. Смолік і А. Шыктараў, рэжысёр—А. Мітрафанаў. Трупа Новасьвецкага Гуртка ўсё што-раз болей заваёўвае сымпатыі работніцкай публікі.

———

У нядзелю 22-га студзеня быў наладжаны спэктакль Студэнцкім Саюзам. Пастаўлены былі п'есы—„На вёсцы“ Ф. Аляхновіча і „Мядзьведзь“ А. Чэхава (ў перакладзе). Поруч з артыстамі-аматарамі з Саюзу ў пастаноўцы п'есаў прымалі ўдзел ужо выробленыя артысты. П'есы прайшлі, асабліва апошняя, з вялікім падняседзьнем. Публіка асталася задаволенай. Хіба толькі псаваў уражаньне той няпрыемны асадак, які астаўся пасьля ўступнага перад спэктаклем рэфэрату Шырана „Праціўгазавая вайна“, у якой аўтар, хаваючыся над парасольчыкам „навуковасьці“, пастараўся ўнясьці і палітычны мамэнт у свой рэфэрат, і гэта зрабіў так няўдала, што публіка мусіла праглынуць яго, як горкую пілюлю.

Цікава, як хутка мяняюць людзі свае перакананьні, не саромячыся гэта навет выставіць перад публікай. Што праўда — рэфэрэнту іх і ня трэба было мяняць, бо... яны былі падвойныя. Выробляецца цікавы тып з нашае „Залатое моладзі“. Гэта тып— „майстра на ўсе рукі“, спэцыяліста па праданьню сумленьня і разам чаго хочаце, тып—„делкакалака“, які выставіў сваім дэвізам—„не абманеш—не прадасі“.

Сумны факт, які хіба можа толькі знайсьці сваё апраўданьне ў ненармальных абставінах нашага жыцьця ў Зах. Беларусі наагул.

Лекцыя. У нядзелю 15 студз. ў памешканьні Народнага Дому пры Галоўнай Управе Т-ва Беларускае Школы адбылася лекцыя гр. Макара Косьцевіча на тэму: „Трагэдыя беларускае інтэлігенцыі“. Лекцыя сабрала шмат слухачоў. На жаль, агульнае ўражаньне, якое засталося ад лекцыі, было сапсована танцулькай, якая распачалася пасьля лекцыі. Думаецца, што на другі раз арганізатары, а імі зьяўляецца Беларусі Студэнцкі Саюз у Вільні, пастараюцца ўхіліць гэту недарэчнасьць.

Рэдукцыя. Вядомы чытачом „Думкі Працы“ панок Ф. Умястоўскі, як відаць, не атрымаў крэдытаў на вядзеньне свае шопкі, бо 16 гэтага студзеня зрэдукаваў сваіх працаўнікоў М. Косьцевіча, А. Бартуля і М. Тулейку. Ці не пачатак гэта канца гэтае авантурніцкае арганізацыі і партыі.

Два дні адпачынку. Міністар Вызнаньняў рэлігійных і Асьветы выдаў загад, на моцы якога ў дзень першага лютага, як пераходны ад першага да другога паўгодзьдзя, усе вучні звальняюцца ад заняткаў у школе.

Узрост безработных. Кажуць, што справы ў Польшчы папраўляюцца, але беспрацоўе ўсьцяж расьце. А гэта вельмі дрэнны паказальнік. На першае студзеня 1928 г. безработных было 164.800, а за тыдзень лік іх павялічыўся яшчэ на 4,360 асоб.

Правакацыйны жэст „Сялянскай Нівы“. У апошнім нумары „Сялянскае Нівы“ пад загалоўкам „І яшчэ раз“ зьмешчаны артыкул, у якім прапануецца „Думцы Працы“ прылучыцца да блёку меншасьцяў. У гэтым артыкуле выказваецца бруднае, фальшывае асьвятленьне справы Грамады і беларускіх паслоў, што стаялі на чале яе. І накідаючы гэныя бруды, „Сялянская Ніва“ дазваляе сабе працягаваць свае брудныя рукі да „Думкі Працы“. Вось да чаго можа дайсьці подласьць Ярэміча і Рагулі.

Відаць, яны ня маюць цьвёрдага грунту пад нагамі, відаць, іх прыхільнікі выстаўляюць ім канкрэтныя дамаганьні, дык, каб адкараскацца ад іх, яны выстаўляюць гэтыя дамаганьні ў такой бруднай форме, робячы жэст перад імі, якога мы інакш ня можам назваць, як правакацыйным. Мы разумеем дамаганьні сялян, якія, атуманеныя Ярэмічам і Рагуляй, усё ж такі разумеюць, куды напалі, і таму выстаўляюць канкрэтныя дамаганьні. Але-ж трэба ведаць, з кім маеш дачыненьне.

7-га лютага с. г. у м. Беластоку будзе разглядацца справа 132 асоб, абвінавачаных з арт. 51 і 102 К. К. у сувязі з арт. 100 ч. І К. К. г. з. у прыналежнасьці да Камун. Партыі Зах. Беларусі. Усе гэтыя арыштаваныя асобы, як відаць з акту абвінавачаньня, які абыймае больш 300 старонак друку, тварылі Цэнтральны Камітэт К.П.З.Б., Беластоцкі Акр. Кам. К.П.З.Б. 1 раённы камітэт, 7 падраённых і некалькі ячэяк. Двох з гэтых арыштаваных—Якуба Чэрніка і Станіслава Мэртэнса 3 студзеня с. г. абмянялі ў СССР, з боку пракуратуры на расправу паклікана 186 сьведкаў, між імі знаходзіцца галоўны сьведка правакатар гэтага працэсу Міхах Гурын, працаўнік „Беларускага Дня“.

27-га студзеня с. г. у м. Слоніме выязной сэсіяй Гарадзенскага Акружнога Суда, будзе разглядацца справа з арт. 102 К. К. аб прыналежнасьці да Камуністычнай Партыі Зах. Беларусі. М. Агушэвіча, Я. Агушэвіча, Емельянчыка Лаўрына, Кавалеўскага Хвёдара, Гарасіка Дзям'яна, Крупніка, Бахрака, Троціка. Усе вышэйпаданыя абвінавачаныя сядзяць ужо на 2 гады ў Слонімскім вастрозе.

У музей ім. Ів. Луцкевіча за апошні час паступіла ад гр. гр. А. Лябецкай са Слоніма і Клімовіча з Вялейшчыны некалькі старых медных манэтаў; ад гр. С. Скуркі (Глыбокае) цэлая калекцыя старых манэтаў, з якіх некалькі зьяўляюцца манэтамі старога Літоўска Беларускага Гаспадарства; ад гр. В. Сосенскага паступіла вялікшая калекцыя разьмешных грашовых марак, выпушчаных пры Часовым Урадзе Керэнскага.

Усім ахвярадаўцам Урад Музею прыносіць шчырую падзяку.

„Маланка“, Выйшаў у сьвет № 1 (1928 г.) знанай беларускім працоўным гушчам гумарыстычнай часопісі „Маланка“ з багатым і цікавым, як заўсёды, зьместам.

З жыцьця Горадні.

Яшчэ палітычны працэс. 9 студзеня с. г. у Гарадзенскім Акружным Судзе пры наступным [illegible]зе судзьдзяў: Навінскага, Ільіна і [illegible]убскага, разглядалася справа 4 сялян Скідзельскае гм., абвінавачаных з арт. 102 К. К. у прыналежнасьці да Камун. Партыі Зах. Беларусі, якая „мела на мэце шляхам аружнага паўстаньня збурыць дасюляшнюю існуючую дзяржаўную ўладу на „kresach“ і ўвясьці дыктатуру пралетарыяту“. Па некалькі-гадзінай нарадзе суд выдаў прысуд, якім дзьвёх асоб засудзіў на 4 гады кожнага, аднаго на 2 гады і аднаго на 1 год 6 месяцаў.

распаўсюджываеце непатрэбныя нам адозвы, бо гэта ня нашая партыя, больш асаднікаў нам ня трэба. Аб іх яна толькі і рупіцца, а не аб нас.

Наш самаўрад і асьвета.

На паседжаньні Косаўскае Гміннае Рады 2/І. 1928 г. на прапазіцыю Косаўскае Акружное Управы Т-ва Беларускае Школы разглядалася пытаньне аб дапамозе беларускім гімназіям і бібліятэкам-чытальням Т-ва Беларускае Школы. Зрабіць даклад па гэтым пытаньням Гмінная Рада даверыла сэкрэтару Косаўскае Акружное Управы Т-ва Беларускае Школы п. Дыльку. Абрысаваўшы палажэньне і ролю ў жыцьці беларускага сялянства, як беларускіх гімназіяў, у якіх вучацца дзеці сялян і работнікаў, так і бібліятэк-чытальняў, грам. Дылька прапанаваў радным асыгнаваць на гэта пэўныя сумы. Аднак, калі прысутны на паседжаньні пан Косаўскі Старэста наперад заявіў сабраньню, што ён не зацьвердзіць пастановы—аб дапамозе беларускім гімназіям, то было аднагалосна ўсімі раднымі пастаноўлена асыгнаваць толькі на беларускія бібліятэкі-чытальні Т-ва Белар. Школы 200 зл. Грамадзяне радныя! Вы павінны былі-б споўніць да канца свой грамадзкі абавязак і вынесьці пастанову аб асыгнаваньні на беларускія гімназіі дапамогі, ня гледзячы на тое, што можа п. Староста зацьвердзіць, ці не вашу пастанову. Няхай ведае ўвесь культурны сьвет як адносяцца, браточкі радныя! — да вашых пастаноў і патрэбаў улады, якія заграніцай у Заходняй Эўропе кажуць усім, што нам, беларусам, жывецца, як у раю, што нам дадзі ўсё патрэбнае для нашага белар. культурна-асьветнага жыцьця.

Беларус радны.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

У сувязі з пушчанай у „Беларускім Слове“ „качкаю“, гэтым заяўляю, што ані з Умястоўскім, ані з кім іншым я не супрацоўнічаю. Маю сваю галаву.

м. Баранавічы.

З пашанай
А. Міткевіч.

Ад Рэдакцыі. Зьмяшчаючы гэтае пісьмо, Рэдакцыя адпак станоўча мусіць сказаць, што аўтар яго таксама ня йдзе разам з фронтам працоўных гушчаў. Мы яшчэ ня ведаем, што знаходзіцца ў „сваей галаве“ пана Міткевіча, але ўжо маем факты: 1) у гэтай „галаве“ ёсьць жаданьне выставіць сваю акруговую лісту бяз ніякага паразуменьня з кіруючымі цэнтрамі лісты працоўных, таді гэтае жаданьне скіравана на разьбіцьцё працоўных сілаў; 2) ад пэўнага часу, бязумоўна, пад кіраўніцтвам гэтага „дзеяча“, у Баранавічах выходзіць цэлы шэраг лістовак, якія, ставячы сябе нявыразна да фронту працоўных — выстаўляюць яго (Міткевіча), як якогась запраўднага змагара за інтарэсы працоўных; 3) Каб быць вядомым працоўным чытачом, п. Міткевіч імкнецца ў цікавы спосаб (пісьмы, надасыланьне лістовак) выкарыстаць радыкальную прэсу; 4) уважаем гэта, гаворачы мягкім словам, за круцельства.

Пасьля ўсяго гэтага маем поўнае ўражаньне і навет перакананьне, што аўтар пісьма, ведаючы настрой працоўных гушчаў, толькі хітрэй іншых закідае свае вудкі ў выбарныя воды. Але...

„Хоть ты и в новой коже,
Но сердце у тебя всё тоже“! —
кажа Крылов пра зьмяю.

Дык і працоўныя мусяць ведаць вагу „працы“ гэтага баранавіцкага „дзеяча“ ў новай вопратцы і яго „галаву“. Пастараемся пры выпадку паінфармаваць больш працоўных і Навагрудзкае Выбарнае Вокругі з аўтарам пісьма, каб яны ня былі ўведзены ў абмылку.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Сельсаюзьнікам ня шэньціць.

(Мір, Навагрудзкага пав.).

Ня гледзячы на ўсю хлусьлю паваднроў Сельсаюзу у сваёй газэцінцэ „Сялянская Ніва“, што сілы іх растуць, праца павялічваецца і што толькі яны адны валадаюць настроямі вёскі, мушу сьцьвердзіць адваротнае. Што ўсе іх высілкі сплываюць нінавошта. Прывяду факт. Былы пасол і б. грамадавец Ю. Сабалеўскі ў нашым мястэчку расьпінаўся і даказваў, што тая лінія, якую ён праводзіць цяпер,—найлепшая (вядома дзеля яго кішані, але не дзеля народу). Раілі яму шчыра, па-суседзку найсьці іноў з тымі людзьмі, якіх ён кінуў (але там яго мусіць ня прымуць) або адыйсьці ад палітычнае працы і не баламуціць беларускае вёскі. Але ўсе гэтыя рады адбіліся ад яго, як гарох ад сьцяны, бо, як відаць, трудна адвыкаць ад пасольскіх дыэтаў, дармовых разьездаў, ну і, вядома, пашаны, якой карыстаўся і якую так любіць. Весь-жа пасьля нефартуннай канфэрэнцыі сельсаюзьнікаў п. Сабалеўскі прыслаў аднаму з нашых мірскіх хлопцаў цэлую пачку свае літаратуры, інструкцыяў, статутаў і інш., але ён, як верны сын свайго народу, як абаронца яго правоў, адаслаў яе назад п. ну Сабалеўскаму дзеля хатняга ўжытку. Пане Сабалеўскі! Досыць вам ужо чмуціць наш народ. Ён ужо добра разгадаў вас, раскусіў вашу здрадніцкую палітыку і ні з вамі, ні з вашымі хаўрусьнікамі ня пойдзе, а калі яны пакажуцца сярод нас, то будзем гнаць іх ад сябе, як шалёных сабак.

Мірскі.

Хто нашы шкоднікі.

(Вёска Урынё, Слонімскага павету).

Па ініцыятыве сьвядомейшых сяброў Угрынскага Гуртка Т-ва Бел. Школы рашылі паставіць на сьвята спэктакль. Знайшліся дзяўчата, хлопцы і думалі, што вось пойдзе ўсё, як па маслу; пойдзе ўся моладзь, а за ёю і старэйшыя, дык п'янству і хаўтурам будзе капут. Але заўсёды дык знойдуцца такія асобы, якім асьвета чаму-сь колле ў вочы. Яшчэ было-б звычайная рэч, каб гэтыя шкоднікі сьвятла на вёсцы былі якія шляхтуны, або панскія падлізы, але ўзялі гэтую агідную ролю свае хлопцы, якія рашуча сталі байкатаваць гэты першы шаг з цемры да сонца. Калі-ж гэтыя паночкі даведаліся, што была ўжо рэпэтыцыя, дык зараз-жа прыказалі не хадзіць на гэтую рэпэтыцыю, „а то галавы паадрываем і ніколі ня пусьцім на музыкі“. Але дзяўчата, якія ня ўзіраюцца на дурныя пагрозы, не паслухалі і рэпэтыцыя йшла далей. Насколькі артысты рыхтаваліся да спэктаклю, настолькі гэтыя „бацькі“ стараліся агітаваць процаў спэктакля. Атрымалі дазвол зрабіць спэктакль у паўшэхнай школе. Зрабілі сцэну, як трэба і чакалі, ня толькі артысты, але і мала што ня ўся вёска.

Прыйшоў другі дзень Каляд і сталі сходзіцца людзі з сваей, а таксама з ваколічных вёсак. Навет жыдоўская інтэлігенцыя прыехала з мястэчка Дзярэчына за 4 ры кілямэтры, спачуваючы гэтаму кроку. І што-ж мы бачым: жанатыя мужчыны папрыходзілі, а кавалеры радам робяць „музыкі“, напіўшыся як тузы! Калі-ж некалькі дзяўчат прыйшлі на спэктакль, а потым пайшлі на музыкі, дык ад іх патрэбавалі па 2 злоты штрафу (ведама-ж на гарэлку для разумных кавалераў?), але за іх уступіўся адзін хлапец, які дэкляраваў за іх заплаціць.

Можа хто падумае, што яны ня ведалі, ў чым справа? Не, ім тлумачылі, што гэта значыць у вёсцы і наагул спэктакль і што ўвесь даход пойдзе на кніжкі для бібліятэкі-чытальні ў сваей-жа вёсцы, дык ня ведама, чаму гэта яны так па-асьлінаму апіраліся. Напэўна, што і самы яны ня ведаюць. Можа хто падумае, што гэта робяць якія блазны? Не, гэта робяць тыя, якія адслужылі ў войску. Для першага разу імёнаў іх поўнасьцю ня буду ставіць, а толькі па літарах, г. ё. Ал. Д., Вл. Т., Мік. Міс. і С. Д. Апошні з іх сказаў, „што мне гэты спэктакль, ня гэткія бачыў у войску. Мне найлепшы спэктакль з дзяўчынаю ў цёмным кутку“.

Ганьба вам, хлопцы, ня толькі ад сваей вёскі і Угрынскага Гуртка Т-ва Бел. Школы, але і ад усяе прабуджаючайся ад сну Бацькаўшчыны! Я прапанаваў бы ўсім вакалічным сябрам Т-ва Белар. Школы навучыць іх, бо думаю, што яны і самы не разумеюць сваіх шкодных пастпукаў супроць вызваленчага руху.

Спэктакль быў адыграны, як выражаліся з вакалічных вёсак сьвядомыя інтэлігенты, надта добра. І сапраўды ўсе артысты выканалі свае ролі проста памастацку. Усе былі задаволеныя і з вялікаю падзякаю разышліся па дамох. Жыды навет шчыра запрашалі гэтыя рэчы адыграць у м-ку Дзярэчыне, у чым ім была дана згода, калі ня будзе перашкодаў. Пакуль што пастанавілі адыграць у в. Азёрках-Вялікіх, таксама на запрашэньню.

„Малады сябра“.

Адозвы.

7-га студзеня г. году былі высланы на зьезд у Лідзе, склІканы пад фірмай Партыі Дробных Рамесьнікаў панам войтам гм. Хаценчыцкай Вялейскага павету Ігнат Грынкевіч з в. Лаўцэвічы, Д. Карповіч з в. Храмцава і асаднікі, якіх у нас ня мала. Адтуль імі прывезена і раздаецца шмат адозваў, надта добрага зьместу, з салодкімі абяцанкамі. Можа-б наіўны селяніны і паверыў бы ім, каб ня было ў іх заклікаў да еднасьці з тымі людзьмі, якім у сваіх рэзалюцыях складаюць даверра ды бачаць адзіны ратунак паны Зубры-Манархісты. Ці-ж аднолькавыя імкненьні бедняка і манархіста?—кожны ведае.

Дык ганьба Вам, сяляне, што за смачныя абеды, якімі Вас трактавалі на зьезьдзе.

Паштовая скрынка.

В. Г. п. Пархвенава, в. Чэркасы. Напішыце поўнасьцю сваё імя і прозьвішча, а то ня ведаем, каму высылаць газэту. — **Яну Мартэну.** Просім падаць свой дакладны адрас. Календары адрыўныя ўжо распрадаліся. — **Аляксандру Піцько.** Адрыўных календароў ужо няма. Мо' выслаць Вам календар-кніжку, каштуе 1 зл.—і што рабіць з другой залатоўкай. — **К. Сьветлавастокаву.** Дзівімся Вашай „працы“. Вы пішаце пісьмо да рэдакцыяў радыкальных газэт з просьбай прысылаць газэту, выстаўляючы сябе прыхільнікам працоўнага народу, а поруч падаеце вясткі ў дэфэнзыўнае „Беларускае Слова“ аб тым, што яны прысылаюцца Вам бяз просьбы. Няўжо Вы ня ведаеце, што Вы тут гуляеце ролю бруднага правакатара і даношчыка і што гэта кампрамітуе ў вачох працоўных масаў, толькі Вас. Пісьмо Ваша і дасюль знаходзіцца ў рэдакцыйным архіве. — **Сымону Быцку.** Пазбаўленьне Вас права галасаваньня Абводовая Камісія магла абаперці на дзеякія пункты „выбарчай ордынацыі“, якая, напрыклад, кажа: ня маюць права выбіраць: 1) „зусім ці часткова пазбаўленыя ўласнавольнасьці“... 3) „правамоцна ўкараныя пастановаю суда, калі аднačасна пастаноўлена аддаць іх пад паліцэйскі надзор, ці ў дом працы ў часе трываньня надзору, ці пабыту ў доме працы, але ў кожным разе ня менш 3-х гадоў з дня правамоцнасьці ўстановы“... Прымаючы пад увагу Ваша палажэньне, камісія магла „тлумачыць“ яго ў свой бок. Ну, і „вытлумачыла“. Відаць—тут нічога ня зробіш.

Рэдактар-Выдавец: Міхалай Шыманскі

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.